ПАДАРМ

Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь

Выпуск № 19 (27)

■ З першых вуснаў

ЖЫЦЦЁ Ў СТЫХІІ ВАДЫ

Гісторыя ваенна-марскога флоту ніяк не атаясамліваецца з нашай краінай. Толькі гэта не значыць, што яе не стваралі беларусы. Узяць хаця б Алега Есіна, які адзін з першых значыцца ў летапісе атамнага падводнага флоту. З яго іменем звязаны і першы паход атамнай падводнай лодкі пад ільдамі Арктыкі. За падзею, падобную палёту ў космас, капітан-лейтэнант быў удастоены высокай дзяржаўнай узнагароды — ордэна Чырвонага Сцяга. Усяго за гады ваеннай службы ён атрымаў каля 20 узнагарод. Нядаўна старшыню грамадскага аб'яднання «Беларускі камітэт ветэранаў падраздзялення асаблівай рызыкі» нечакана напаткала яшчэ адна. Як ён сам прызнаецца, асаблівая. За працоўныя заслугі, поспехі ў працы і культурныя дасягненні кіраўнік дзяржавы ўручыў Алегу Есіну ордэн Айчыны III ступені.

Неўзабаве мы сустрэліся з былым падводнікам. Рыхтуючыся да інтэрв'ю, я разлічвала на кароткія і сухія адказы, як і належыць ваеннаму чалавеку. Толькі Алегу Есіну ўдалося зламаць усе мае стэрэатыпы пра вайскоўцаў. Я адкрыла для сябе эмацыянальнага, шчырага і цікавага суразмоўцу, Чалавека з вялікай літары.

Алег ЕСІН з жонкай Ларысай Мікалаеўнай разам ужо больш за паўвека. Выхавалі дваіх сыноў — Сяргея і Руслана. Сёння дзеляцца жыццёвым вопытам з трыма ўнучкамі.

— Алег Паўлавіч, каб пералічыць усе вашы ўзнагароды, пальцаў рукі не хопіць. Якое значэнне для вас мае новае прызнанне?

— Гэтую ўзнагароду я ацэньваю не як асабіста мне. Ордэн Айчыны III ступені — узнагарода ўсяму нашаму калектыву, усім тым людзям, якія стваралі «ядзерны шчыт» тагачаснай дзяржавы. Кожны з іх — герой і заслугоўвае такога ж прызнання.

— Раскажыце пра сваё дзяцінства. Вы, напэўна, з дынастыі вайскоўцаў?

— Якраз і не. Мой бацька — Павел Васільевіч — з роду чыгуначнікаў. Усе яго нашчадкі так ці інакш звязаны з чыгункай. Акрамя мяне. Бацька быў адзін з тых 25-тысячнікаў, якіх падчас савецкай улады накіравалі на аднаўленне сельскай гаспадаркі. Быў старшынёй калгаса. Працаваў так старанна, што ў Падмаскоўі ёсць вёска, якая носіць яго імя, — Есіна. Усю вайну прайшоў мінёрам-сапёрам. Вярнуўся кантужаным, але жывым. Працаваў намеснікам старшыні гарвыканкама ў галіне сельскай гаспадаркі. За поспехі ў працы быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, меў і баявыя ўзнагароды. Памёр вельмі рана — у 57 гадоў. Маці — педагагічны супрацоўнік: вучыла дзяцей музыцы. Паспявала выхоўваць і сваіх чацвярых.

— Ці наведваеце малую радзіму?

— Я нарадзіўся ў Тульскай вобласці. Пасёлак Малочныя Двары. На жаль, ужо будучы дарослым, ні разу там і не быў. Увесь час перарэзджалі з аднаго месца на іншае. Жыццё было як у сям'і вайскоўцаў.

— Магчыма, бацькі і паўплывалі на ваш выбар стаць мараком-падводнікам?

— Памыляецеся. З дзяцінства мяне цягнула да караблебудавання. Майстраваць мадэлі караблёў было маім захапленнем. Памятаю апошні выраб. Гэта быў крэйсер паўтара метра даўжынёй, з рухавіком на батарэйках. Я запускаў яго ў ваду і па радыёўстаноўцы ім кіраваў.

— А як тады апынуліся ў Ленінградзе — у Вышэйшым ваенна-марскім інжынерным вучылішчы імя Дзяржынскага?

— З гэтым звязаны цікавы выпадак. Аднойчы на летніх канікулах я з аднакласнікамі паехаў у Ленінград. Мне вельмі хацелася паглядзець караблебудаўнічы інстытут, даведацца, якія патрэбна падаваць дакументы. Праўда, туды я так і не трапіў. Па дарозе ў наш вагон зайшоў марак. Сеў побач і пачаў цікавіцца, хто мы і адкуль. А потым мне і кажа: «А навошта табе паступаць у караблебудаўнічы? У нас ёсць Вышэйшае ваенна-марское вучылішча. Там і будзеш займацца караблямі: і будаваць, і рамантаваць, і ў мора хадзіць».

— У тое ж імгненне ваш лёс быў вырашаны?

— Так. У 1957 годзе я стаў курсантам факультэта надводных караблёў. Памяць пра гады навучання засталася самая лепшая. Аб гэтым вучылішчы ўвогуле можна казаць шмат цікавага. Па-першае, будынак навучальнай установы — былое адміралцейства, дзе размяшчаўся штаб ваенна-марскога флоту Расіі. Па-другое, паступіць у вучылішча было вельмі складана: яно было на ўзроўні Маскоўскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя Баўмана. Па-трэцяе, тут працаваў вельмі моцны прафесарска-выкладчыцкі склад.

— Як жа тады атрымалася, што вучыліся засвоіць надводныя караблі, а амаль усё прафесійнае жыццё правялі пад вадой?

— Калі я быў на другім курсе, у нас адкрылі сакрэтны факультэт, дзе ўпершыню пачалі рыхтаваць спецыялістаў для падводных лодак. На факультэт прапанавалі паступаць добраахвотнікам з іншых курсаў, якія вучыліся на «выдатна». А я вучыўся добра. Усё гэта мне неяк лёгка давалася. І школу ў свой час скончыў з адной чацвёркай — па хіміі. Вось і апынуўся ў ліку першых курсантаў-атамшчыкаў. Таму замест патрэбных пяці гадоў адвучыўся шэсць.

— І як курсанту першага факультэта па падрыхтоўцы атамшчыкаў-падводнікаў давалася вучоба?

— Вучыўся лёгка. Нават вышэйшая матэматыка давалася проста. Настолькі яе любіў, што нават і сёння часам бачу сны, як стаю каля дошкі і пішу гэтыя формулы. Хаця, шчыра кажучы, у жыцці яна не спатрэбілася. Самае каштоўнае — тое, што выкладчыкі нас прывучылі думаць і самастойна працаваць. На «выдатна» абараніў дыплом па аўтаматыцы і тэлемеханіцы. Сустракаў пасля выпускнікоў іншых курсаў, якія казалі, што 5 гадоў мой дыплом перапісвалі.

— І пасля навучання — адразу ў мора?

— Калі ў апошнія дні знаходжання ў вучылішчы нам сказалі: «Падыміце рукі, хто хоча на флот?» — я быў сярод тых, хто хацеў. І трапіў на Поўнач, камандзірам групы аўтаматыкі і тэлемеханікі на чацвёртую атамную лодку «К-14». Мы з Лорачкай (*з жонкай* — **Аўт.**) прыехалі туды. Побач жонка, я трымаю яе за руку, а на мосціку стаіць камандзір лодкі і кажа: «Лейтэнант, вы куды прыбылі?» Я кажу: «На карабель «К-14». «А гэта хто з вамі?» — пытаецца. «Жонка», — адказваю я. «А вы што не ведаеце, што тут жыць няма дзе?» Адным словам, у лодку я трапіў адзін (*смяецца*).

— Напэўна, першы падводны паход запомніўся на ўсё жыццё?

— Якраз падыходзілі карыбскія падзеі 1962 года, і лодка рыхтавалася ісці туды ў паход. Мы збіраліся на Кубу. Праўда, адышлі недалёка. Толькі пераадолелі Баранцава мора, як актыўная зона рэактара левага борта выйшла са строю. І ўся радыёактыўнасць «паляцела» ў адсекі. Аб'явілі радыяцыйную небяспеку. Я быў камандзірам групы аўтаматыкі і тэлемеханікі ядзернай энергетычнай установкі. Адным словам, усе пераключэнні і выключэнні выконваў я. Калі аўтаматыка выйшла са строю, апускаць кампенсуючую рашотку ў радыеактыўным адсеку прыйшлося мне разам са сваім начальнікам. Тады мы атрымалі вялікую дозу апрамянення. Атрымалася, што першы блін быў комам: першы паход і адразу ліквідацыя аварыі на караблі. На шчасце, усё прайшло паспяхова. На гэтым наш паход закончыўся.

— Ці не за гэты паход вы сталі першым, хто заслужыў званне «майстар ваеннай справы» ў сферы аўтаматыкі і энергаўстановак?

— Не. Гэта за далёкі паход на дызельнай падводнай лодцы, калі яшчэ быў курсантам. Як толькі ўвялі такое званне, я першым здаў экзамен. І з гонарам павесіў знак *(Алег Паўлавіч паказвае маленькую лодку з крыламі на сваім пінжаку.)* А гэта камандзірскі знак *(паказвае на іншы карабель)* — самы каштоўны: я маю права самастойна кіраваць падводнай лодкай.

— Раскажыце пра першы ў СССР паход атамнай падводнай лодкі пад ільдамі Арктыкі. За кіраванне атамнай энергаўстаноўкай вы былі ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга...

— Калі мяне прызначылі камандзірам дывізіёна жывучасці, у 1966 годзе мы атрымалі каманду — пад ільдамі перайсці з Североморска на Камчатку. Наша лодка прыйшла туды першай. Пад ільдамі Арктыкі мы правялі 25 сутак. Паход быў складаным. Перад тым, як выйсці ў мора, нас сабраў камандуючы Паўночнага флоту і сказаў: «Хто не хоча прымаць у гэтым удзел, выйдзіце са строю. Да вас мы не будзем мець ніякіх прэтэнзій». Выйшаў толькі адзін лейтэнант. Астатнія засталіся на месцы. Адным словам, у Арктыку пайшлі добраахвотнікі. У іх ліку быў і я. Мы павінны былі ўсплыць на Паўночным полюсе, затым у палонцы, дзе размяшчалася станцыя палярнікаў. Яны сачылі за метэаўмовамі, але іх галоўнай задачай з'яўлялася ахова межаў Расіі з Паўночным Ледавітым акіянам. Мы ім павінны былі перадаць харчаванне. Самалёты гэтага зрабіць не маглі: вельмі складаным было метэастановішча.

— Няўжо мэтай такога складанага паходу была толькі перадача прадуктаў?

— Вядома, не. Па-першае, мы высветлілі, што пад ільдамі можна хадзіць. Па-другое, мы адназначна ўпэўніліся ў наяўнасці там амерыканскіх атамных падводных лодак. Па-трэцяе, мы праверылі працаздольнасць нашай энергетычнай установкі. Ды і што ўтойваць: гэты паход стаў найважнейшай адпрацоўкай экіпажа. Пасля паходу экіпаж нельга было пазнаць: людзі пасябравалі і сталі яшчэ больш адказнымі на сваіх пастах. За паход камандзір лодкі быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза. Такога доўгага і якаснага падарожжа больш ніхто ніколі не паўтарыў.

— Далейшая служба была менш рызыкоўнай?

— Усяляк было. На гэтай жа лодцы я стаў камандзірам БЧ-5. Прычым першым у званні капітан-лейтэнанта! Такога маладога камандзіра больш не было ні на адной атамнай падводнай лодцы. Пасля паходу ў Ціхім акіяне атрымаў званне капітана 3-га ранга. У 1969 годзе ўжо другі раз займаўся ліквідацыяй аварыі. Праўда, ужо ў ролі камандзіра БЧ-5. Цяпер на мне была поўная адказнасць. На шчасце, справіліся паспяхова, усе засталіся жывымі. Гэты вопыт спатрэбіўся на зборах, дзе мы дзяліліся ім з іншымі вайскоўцамі. На гэтых зборах прысутнічаў намеснік начальніка тэхнічнага кіравання флоту капітан 1-га ранга Уладзімір Папоў. Пасля майго дакладу ён падыходзіць да мяне і пытае: «У тэхнічнае кіраванне флотам пойдзеш?» Я кажу: «Кім?» «Начальнікам аддзела эксплуатацыі баявой падрыхтоўкі атамных лодак Ціхаакіянскага флоту на пасадзе капітана 1-га ранга», — прыемна здзівіў ён мяне. І мы з жонкай ізноў сабралі чамаданы і паехалі ва Уладзівасток, дзе я 7 гадоў адказваў за ўсе падводныя лодкі Ціхаакіянскага флоту. Я павінен быў у любы час ведаць, у якім становішчы знаходзіцца тая ці іншая лодка.

(Заканчэнне на 4-й стар.)

■ Рэха падзеі

Спеўны вечар дабрыні, ці Калі мары становяцца явай

У адзін з апошніх вераснёўскіх вечароў у Глыбокае завітаў Акадэмічны ансамбль песні і танца Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь і падарыў глыбачанам незабыўны вечар творчасці, прыгажосці і дабрыні.

На канцэрце прысутнічала сям'я з Падсвілля, якая атрымлівала асалоду ад убачанага і пачутага ўжо другі раз — гэта Людміла Паўлаўна Альсевіч і яе ўнукі Насця і Ян. Справа ў тым, што летам ансамбль прыязджаў на свята «Падсвільскі світанак», і там маленькі Ян проста не зводзіў вачэй з прыгожых і статных ваенных, якія выдатна спявалі і па-заліхвацку танцавалі. І нездарма адміністратар калектыву Ала Сушч яго заўважыла падчас канцэрта: хлопчык танцаваў увесь час з балетам. Яна прафесійным вокам балетмайстра ацаніла пластычныя рухі юнага танцора.

Напрыканцы выступлення ансамбля да Алы Анатольеўны падышла мілавідная жанчына (як аказалася, бабуля няўрымслівага хлопчыка) і расказала пра запаветную мару свайго ўнука. Аказваецца, Ян марыць стаць ваенным, дакладней, дэсантнікам, а каб наблізіць сваю мару, яму вельмі ж хочацца мець і форму: сапраўдны блакітны берэт і цяльняшку. Адмовіць Людміле Альсевіч, якая выхоўвае ўнукаў-сірот адна і ніколі і ні да каго не звярталася па дапамогу, было проста немагчыма...

— Як і трэба ўсім ваенным, прыехаўшы з гастроляў, я далажыла пра гэты выпадак начальніку, Уладзіміру Варапаеву, — ужо з глыбоцкай сцэны гарадскога Дома культуры згадвала **Ала СУШЧ** мінулыя падзеі. — Падумалі і вырашылі пашыць касцюм, як у маленькіх артыстаў з дзіцячай студыі «Зорачкі» (*створана ў верасні 2008 года пры Акадэмічным ансамблі песні і танца*. — **Аўт.**). Якраз паглядзелі, што ў Глыбокім у нас па графіку канцэрт. І я патэлефанавала той чароўнай жанчыне, якая падыходзіла да мяне, і запрасіла яе папрысутнічаць на нашым мерапрыемстве. Трэба сказаць, што вайскоўцы ўмеюць ацэньваць становішча імгненна і дакладна: Уладзімір Сяргеевіч звязаўся па тэлефоне са сваім знаёмым генералам і расказаў пра мару юнага падсвільчаніна.

— Ёсць у хлопчыка такая мара — значыць, будзем дапамагаць у яе здзяйсненні, — паабяцаў генерал.

...І вось ужо на глыбоцкай сцэне разам са сваёй сям'ёй — групай падтрымкі — хвалюецца Ян.

— Ты мне паверыў? — спыталася ў хлопчыка Ала Анатольеўна. — Лічы, што твая мара збылася!

На сцэну выйшаў **генерал-маёр Алег БЕЛАКОНЕЎ, камандуючы сіламі спецыяльных апе-**

Яну АЛЬСЕВІЧУ — падарункі ад Алега БЕЛАКОНЕВА.

Фота Алены МЕНЬКЫНСКАЙ.

рацый Узброеных Сіл Беларусі. Ён звярнуўся да прысутных у зале і асабіста да Яна:

— Ёсць такая прафесія — Радзіму абараняць. І добра, што маленькі хлопчык марыць стаць дэсантнікам. Веру, што дзякуючы сваёй настойлівасці і выдатнай вучобе, ты зможаш прысвяціць жыццё абароне Айчыны!

Алег Аляксеевіч уручыў хлопчыку вымпел сіл спецыяльных аперацый з лагатыпам нядаўна праведзеных вучэнняў «Захад-2013» і самае жаданае і чаканае: сапраўдныя цяльняшку і блакітны берэт. А яшчэ генерал падарыў Яну імянны гадзіннік.

Аказваецца, мары здзяйсняюцца не толькі пад Новы год... Шчаслівыя вочы хлопчыка свяцілія, і ад гэтага іскрыстага святла ўсім дарослым халодны восеньскі вечар здаваўся цёплым і сонечным. Дарэчы, скажам вам па сакрэце, Алег Белаконеў паабяцаў Яну трымаць сяброўскія сувязі да здзяйснення яго запаветнай мары — стаць дэсантнікам. А пакуль прысвяціў яму гімн дэсантнікаў.

Алена ХАЙНОЎСКАЯ.

г. Глыбокае

■ Змагаліся за Радзіму

СПРАВЫ РАГАЧОЎСКІХ ПАРТЫЗАН

Партызанам 8-й Рагачоўскай партызанскай брыгады Леанід Калінковіч стаў у верасні 1943 года. Каб патрапіць у брыгаду, давялося ісці на некаторыя хітрасці. Калі хлопцы-аднагодкі плакалі, што іх не бяруць у партызаны, Леанід прыбавіў сабе год. Так 17-гадовы юнак быў залічаны ў брыгаду.

«У канцы верасня 1943 года на ўскрайку вёскі Блізняцы Рагачоўскага раёна, размешчаную за 1,5—2 км ад Рагачова, затаіліся 15 партызан 8-й Рагачоўскай партызанскай брыгады. Чакалі змяркання, каб пайсці выконваць заданні камандавання — каму правесці разведку, каму сустрэцца з сувязнымі, каму мініраваць чыгунку. Апошняе датычылася групы мінёраў на чале з былым механікам МТС Васілём Яркіным.

На выходзе дня міма нас прайшла маладая жанчына, на хаду прамовіўшы: «Эй вы, партызаны! За вёскай, на лузе, немцы на драбіны грузяць сена».

Яркін распытаў яе, дзе яна бачыла немцаў і колькі іх, а затым звярнуўся да нас: «Хто пойдзе са мною ў бой?» Падняліся ўсе.

Аперацыяй кіраваў Яркін. Разведаўшы месца, дзе некалькі ўзброеных акупантаў на лузе каля Друці грузяць сялянскае сена на дзве драбіны, Яркін павёў нас туды.

З краю вёскі пачыналася драбналессе (альшанік, арэшнік, сасняк). Яркін падаў каманду «рассыпацца» ланцугом, і мы рушылі да краю лугавіны, хаваючыся за кустамі і прыгінаючыся. Уздоўж лугу коні цягнулі два вялікія вазы сена. На кожным возе сядзелі са стрэльбамі па два фашысты, па баках ішлі яшчэ чатыры.

Яркін выбег з-за куста і з камандай «Бі іх, гадаў» даў некалькі чэргаў з аўтамата. Мы кінуліся наперад, страляючы па постацях у нямецкай форме.

Баявая аперацыя цягнулася не больш за 10 хвілін. Адзін конь быў паранены, другога распрэглі. Двое партызан з-за кустоў з боку рэчкі вывелі захопленага ў палон маладога хлопца ў нямецкай форме. Гэта быў уласавец. Партызаны даведаліся, што немец, які кіраваў загатоўкай сена, убачыўшы іх, пабег з уласаўцам да рэчкі. Там аддаў стрэльбу яму і загадаў страляць па партызанах, а сам кінуўся ў ваду. Але ўласавец кінуў стрэльбу і падняў рукі ўгору. А немца застрэлілі, ён патануў.

Сабраўшы нямецкую зброю і іншыя трафеі, мы шпарка пабеглі ў Блізняцы і далей у Канапліцы. Побач — Рагачоў з вялікім гарнізонам. Трэба было як мага хутчэй адыходзіць. Пачуўшы стральніну, жыхары вёскі таксама сталі пакідаць хаты і падавацца да лесу.

Раніцай нехта з мясцовых жыхароў прынёс вестку, што ў Блізняцах немцаў няма і не было. Тры партызаны палічылі, што ёсць магчымасць дастаць зброю патануўшага фашыста або якінебудзь іншы трафей. Яны схадзілі ў Блізняцы, ныралі ў тым затоне, але нічога не знайшлі.

Потым разведка данесла, што акупанты толькі праз некалькі дзён забралі сваіх загінулых «нарыхтоўшчыкаў сена». Вёску не палілі. А па Рагачове хадзілі чуткі, што засаду зрабіў батальён дэсантнікаў. Нашы разведчыкі дазналіся, што з вёскі Буда, дзе знаходзіўся нямецкі гарнізон, часта ў Крушынаўку ездзіць абоз за бульбай і сенам. Вырашалі зрабіць засаду. У цемры, ажно да світанку, партызаны размеркаваліся ў дварах крайніх хат з боку Буды, да якой было кіламетры з два, не больш. Жыхароў у вёсцы было вельмі мала. Дзе-нідзе заставаліся старыя ды хворыя. Астатнія былі ў лесе, жылі ў зямлянках.

Толькі ў адзінаццаць гадзін раніцы з Буды паказаліся чатыры верхавыя на конях і шасцёра на двух санях, на якіх былі ўсталяваны кулямёты. Усе былі ў нямецкай форме і са зброяй. Першая пара прышпорыла коней і ўехала ў вёску. Яны спешыліся каля хаты, увайшлі ў двор і былі абязброены партызанамі, не паспеўшы падняць трывогу. Астатнія абознікі шчыльнай групай даехалі да першых хат і адразу трапілі пад агонь партызан.

У лічаныя хвіліны бой скончыўся. Мы шпарка пабеглі да сярэдзіны вёскі, дзе пакінулі сваіх коней.

Пераначаваўшы ў лесе, назаўтра падаліся ў свой лагер, у Клічаўскі раён. У гэтым баі было забіта 9 фашыстаў. Крушынаўку немцы потым не спалілі. Яна згарэла ў чэрвені 1944 года, калі пачалася вызваленчая аперацыя «Багратыён».

Леанід КАЛІНКОВІЧ,

г. Мінск

■ Унікальнае падраздзяленне

«ХІМІЧНЫЯ» САЛДАТЫ

Канец жніўня 1943 года. Прайшоў толькі тыдзень, як на Курскай дузе скончыліся грандыёзныя танкавыя баі. У гэты пераломны для ваеннага ліхалецця час у пасёлку Каціха прыфрантавой Іванаўскай вобласці было створана спецыяльнае падраздзяленне — 8-ы Варшаўскі ордэна Чырвонай Зоркі полк радыяцыйнай, хімічнай і біялагічнай абароны. Сёлета гэтая вайсковая часць адзначыла сямідзясяты дзень нараджэння.

Першапачаткова байцы палка павінны былі прыкрываць дымамі ад праціўніка як важныя стратэгічныя аб'екты кшталту аэрадромаў, чыгуначных станцый, шпіталяў, так і савецкіх ваяроў, якія ішлі ў наступленне... «Баявое хрышчэнне» полк атрымаў у маі 1944-га пры вызваленні горада Карасцень, што ў Жытомірскай вобласці Украіны. Пасля ваенныя дзеянні перамясціліся ўжо за межы савецкай тэрыторыі. Асабліва вызначыліся байцы-хімікі пры маскіроўцы нашых войск падчас баёў за Варшаву. Што і было пасля ўганаравана ў назве палка. Пазней было фарсіраванне легендарнага Одэра, узяцце нямецкіх гарадоў Арнсвальдэ і Альтдама...

— Толькі ўявіце сабе: шэсць воінаў палка за год сталі кавалерамі ордэна Вялікай Айчыннай вайны, — гаворыць **намеснік камандзіра палка па ідэалагічнай працы Аляксей КОЗАК.** — Усяго ж тады ўзнагароды атрымалі 82 байцы. У мірны час полк набыў сталую прапіску на беларускай зямлі. Наша часць амаль сем гадоў базіравалася ў Жыткавічах, але ў чэрвені 1952 года перадыслацыравалася ў Старыя Дарогі, дзе і знаходзіцца дагэтуль. Увогуле, такі полк у сучаснай Беларусі адзіны, які спецыялізуецца менавіта на супрацьстаянні зброі масавага знішчэння.

Задачы перад палком у пасляваенны час значна ўскладніліся. Пасля атамнай бамбардзіроўкі Японіі стала зразумела: нябачная вокам зброя пачынае шэсце па планеце. Таму баявая праца палка пашырылася. Да абавязкаў воінаў-хімікаў дадалася яшчэ і абарона ад радыяцыйнага забруджвання ды біялагічнай зброі. А вучыцца гэтаму даводзілася ўжо ва ўмовах «халоднай вайны». І замацоўваць тэорыю на практыцы. Увесну 1986-га, калі грымнуў Чарнобыль, байцы 8-га палка дапамагалі ачышчаць ад радыеактыўнага пылу дарогі, дэзактывавалі забруджаныя будынкі і глебу. З гумарам ужо сівыя колішнія камандзіры палка ўспамінаюць і так званыя «цалінныя батальёны», калі вайскоўцы перакваліфікоўваліся на некалькі месяцаў у зборшчыкаў ураджаю.

Цяпер жа асабісты састаў палка дэманструе стабільна выдатныя вынікі падчас штогадовых беларуска-расійскіх вучэнняў, рыхтуючыся да іх фактычна круглы год. Паколькі ў адным палку служаць хімікі, біёлагі, радыёлагі, то сумесная праца ўсіх батальёнаў павінна быць адладжанай, як механізм у гадзінніку. Іншых варыянтаў проста не існуе.

Не толькі хлебам вучэнняў сыты салдат. Першае ўражанне аб месцы, дзе яму выпадзе адслужыць пэўны тэрмін, складзецца літаральна праз некалькі хвілін пасля праходжання праз кантрольна-прапускны пункт. Усё-такі, як кажуць, па адзенні сустракаюць, а па розуме праводзяць. Тут полк выглядае даволі выйгрышна: матэрыяльную базу. За кошт бюджэтных сродкаў вайскоўцы адрамантавалі КПП, сталовую, будынак штаба, склады... Але яны ідуць далей, на дасягнутым спыняцца не збіраюцца. У планах — ахапіць сістэмай відэаназірання як мага большую тэрыторыю і значна зменшыць колькасць вартавых.

— Гэта здаецца зараз неверагодным, але на пачатку васьмідзясятых у нас служылі нават некалькі цыган. І лайдакамі іх назваць нельга было! — успамінае **палкоўнік запасу Анатоль ГАРКАВЕНКА,**

які дзесяць гадоў камандаваў палком. — Я не быў у Старых Дарогах ужо ад пачатку нулявых. За гэты час шмат чаго змянілася... Ваенны гарадок стаў больш маляўнічым. Знікла тая побытавая паўсядзённая шэрасць, якая праследавала нас не адно дзесяцігоддзе.

Часць справіла ў мінулым месяцы яшчэ адзін юбілей. 16 жніўня 2003 года 8-ы Варшаўскі ордэна Чырвонай Зоркі полк радыяцыйнай, хімічнай і біялагічнай абароны стаў першым, які ў справе абароны Айчыны наладзіў супрацоўніцтва з праваслаўнай царквой. На тэрыторыі палка дзверы расчыніў храм святога дабравернага князя Аляксандра Неўскага. Такога на Беларусі не было з часоў Кастрычніцкай рэвалюцыі!

Кожную апошнюю нядзелю месяца і напярэдадні царкоўных свят у храме адбываюцца набажэнствы. Да важных вайсковых дат, кшталту Дня абаронцаў Айчыны ці дня прыняцця воінскай прысягі, у царкве служыцца малебен. Не зарастае да храма сцежка і ў вольны час салдат. Дбаюць у палку і пра ваенна-патрыятычную працу ў горадзе.

Школьныя ўрокі дапрызыўнай ваеннай падрыхтоўкі скончыліся для многіх людзей на ўзроўні ведання ўстройства аўтамата ды навыкаў страявога кроку. Старадарожскі полк пайшоў у гэтай справе далей. У гарадской сярэдняй школе №3 з'явіліся спецыяльныя класы ваенна-патрыятычнага выхавання. Але не забываюцца вайскоўцы і на іншыя навучальныя ўстановы. Паўсюдна рэгулярна праводзяцца ўрокі мужнасці. У воінскай часці праходзяць дні адчыненых дзвярэй, дзе кожны школьнік можа паглядзець на тое, у якіх умовах нясуць службу воіны-хімікі. І гэта ўжо не кажучы пра традыцыйную ваенна-спартыўную гульню «Зарніца»... Адным словам, камандаванне палка імкнецца ўсяляк супрацоўнічаць з падлеткамі, якія ўжо праз некалькі гадоў апрануць ваенную форму.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

г. Старыя Дарогі